Першы ў вобласці рэсурсны цэнтр комплекснай дапамогі дзецям з аўтызмам адкрыўся ў Брэсце

05.11.2021 11:29 **Аўтар: Святлана Яскевіч (/be/tags/svyatlana-yaskevich)** **Фота: Валерый Кароль (/be/author/valeryy-karol)** **Грамадства (/be/gramadstva)**

На ўрачыстае адкрыццё новай установы сабраліся прадстаўнікі гарадской улады і грамадскасці, будаўнікі, дэпутаты, шматлікія госці. Мерапрыемства стала падвядзеннем вынікаў рэалізацыі праекта трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча-Беларусь-Украіна».

(ht



Цэнтр абсталявалі на базе былога дзіцячага садка па вуліцы Куйбышава. За год у будынку ранейшай дашкольнай установы зроблены капітальны рамонт з элементамі мадэрнізацыі. Цэнтр з'яўляецца структурным падраздзяленнем дапаможнай школы.

Пакуль названы рэсурсны цэнтр адзіны ў рэспубліцы. Як заўважыў кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Брэста Валянцін МІЛАШЭЎСКІ, у Брэсце не раз рэалізоўваліся пілотныя праекты ў плане аказання дапамогі дзецям. Можна назваць, напрыклад, медыцынскі цэнтр «Тонус» для рэабілітацыі дзяцей з захворваннямі нервовай сістэмы. Вось і зараз тэлефануюць бацькі з іншых рэгіёнаў краіны, пытаюцца, ці можна прыехаць з дзецьмі альбо атрымаць кансультацыю. У першую чаргу цэнтр будзе абслугоўваць дзяцей з Брэста, а вось кансультацыю змогуць атрымаць бацькі з любога горада альбо вёскі.

> Неабходнасць падобнай установы наспела даўно. У апошнія гады заўважаецца рост колькасці дзяцей з аўтызмам. Сёння ў Брэсце і Брэсцкім раёне 122 хлопчыкам і дзяўчынкам пастаўлены дыягназ «аўтызм». Але ёсць і катэгорыя дзяцей, якія маюць аўтыстычныя парушэнні рознай ступені, яны таксама маюць патрэбу ў карэкцыйна-педагагічнай дапамозе. Рэсурсны цэнтр дае магчымасць вузканакіраванай работы з дзецьмі, якім патрэбна дапамога.

Займацца ў цэнтры пастаянна змогуць 35-40 дзяцей. Яго дырэктар Людміла ДЗЕНІСЕВІЧ расказала, што ў іх бліжэйшых планах стварэнне груп кароткатэрміновага знаходжання дзяцей дашкольнага ўзросту. У групах па 3-4 чалавекі з індывідуальным кіраўніком яны змогуць набыць навыкі, што патрэбныя для сацыялізацыі ў дзіцячым садку, пазней — у школе. Бо такія дзеці, як правіла, трапляюць у садок не падрыхтаванымі, і тады ўзнікаюць праблемы. Бацькі таксама маюць патрэбу ў псіхалагічнай падтрымцы і кансультацыях. Вось гэтым і зоймецца цэнтр.

(ht



Для заняткаў тут створана неабходнае асяроддзе. Абсталяваная сенсорна-дынамічная зала са спецыяльнымі арэлямі і платформамі, ёсць пакоі са светлавым і акустычным абсталяваннем. Ёсць таксама вучэбныя класы, кабінеты дэфектолага, псіхолага, легатэкі і іншыя. Двухпавярховы будынак забяспечаны безбар'ерным асяроддзем — ёсць пандус і ліфт-пад'ёмнік.

> Акрамя заняткаў цэнтр будзе выконваць метадычную функцыю. У канферэнц-зале плануецца праводзіць навучанне запрошанымі спецыялістамі педагогаў, у тым ліку агульнаадукацыйных школ розным методыкам работы з дзецьмі, якія маюць парушэнні аўтыстычнага спектра. Педагогі, якія будуць працаваць тут, прайшлі навучанне рабоце на сучасным абсталяванні ў Польшчы.

Як ужо гаварылася, адкрыццё цэнтра стала вынікам рэалізацыі праекта трансгранічнага супрацоўніцтва альбо сумеснай работы ўпраўлення па адукацыі Ленінскага раёна Брэста і Асацыяцыі дапамогі дзецям з аўтызмам «Агульны свет» з Бяла-Падляскі. Кіраўнік асацыяцыі Ганна ХВАЛЭК назвала падзею святам агульнай работы і ўдакладніла: «Сённяшняе свята пачатак вялікай работы, бо з уласнага вопыту ведаю, як настойліва трэба будзе вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю педагогам, супрацоўнікам, каб працаваць з гэтымі дзецьмі, каб ісці ў нагу з часам у плане карыстання лепшым сусветным вопытам».



Галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Аляксандр КАРПІЦКІ падкрэсліў своечасовасць і важнасць з'яўлення такога цэнтра:

(https://www.butb.by/)

> — Калі своечасова заўважыць у дзяцей гэтую іх асаблівасць і правільна дапамагчы, то 50-60 працэнтаў дашкольнікаў змогуць пайсці ў дзіцячы садок і засвойваць праграму як дашкольнай, так пазней і школьнай адукацыі, таму вельмі важна тое, што вы сёння зрабілі — адзначыў сенатар і дадаў — асаблівай падзякі заслугоўваюць прадстаўнікі асацыяцыі «Агульны свет». Па-першае, за іх кампетэнцыю, настойлівасць у прасоўванні ідэі дапамогі асаблівым дзецям, за гатоўнасць дзяліцца вопытам, а па-другое, за спрыянне ў справе прыцягнення сродкаў, Еўрасаюз выдзеліў на праект больш за 400 тысяч еўра.

Паводле слоў Аляксандра Карпіцкага, рэалізацыя такіх праектаў збліжае людзей з абодвух бакоў Буга. Гэта важна для перспектывы, для новых праектаў.

Пры ўручэнні сімвалічнага ключа гендырэктар будаўнічай кампаніі «Прадом» Андрэй ДЗЬЯКАЎ выразіў агульны настрой словамі: «Хачу, каб дзеці, якія прыйдуць сюды, сталі крышку шчаслівейшымі».

Святлана ЯСКЕВІЧ

Фота Валерыя КАРАЛЯ

Чытайце таксама

«Трыўмф музыкі», «9 секунд» і «Катавасія і Пёсасторыя» (/be/news/20241002/1727871817-afishka)

«Маме зноў 17», «Смехатэрапія» і «Бабін бунт» (/be/news/20240923/1727094545-afishka)

У Брэсце праходзіць XIX Рэспубліканская міжгаліновая спартакіяда прафсаюзаў (/be/news/20240927/1727433624-u-bresce-prahodzic-xix-respublikanskaya-mizhgalinovaya-spartakiyada)

Сумеснымі намаганнямі прадухіліць трагедыю (/be/news/20240924/1727189383-sumesnymi-namagannyami-praduhilic-tragedyyu)

«Халоп з Парыжа»,«Трыбунал» і «Лілічка» (/be/news/20240918/1726671374-halop-z-paryzhatrybunal-i-lilichka)

Тэгі:

адкрыццё (/be/tags/adkryccyo) | «Польшча-Беларусь-Украіна» (/be/tags/polshcha-belarus-ukraina) | мерапрыемства (/be/tags/merapryemstva) | цэнтр комплекснай дапамогі (/be/tags/centr-kompleksnay-dapamogi) | Брэст (/be/tags/brest)

826 праглядаў Друкаваная версія (/be/print/229838)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20211105%2F1636100987-pershy-u-
(https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20211105%2F1636100987-pershy-u
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%9F%D0%B5%D1%80%D1%88%D1%8B%20%D1%9E%20%D0%B2%D0%
(viber://forward?text=%D0%9F%D0%B5%D1%80%D1%88%D1%8B%20%D1%9E%20%D0%B2%D0%BE%D0%B1%D
(https://t.me/share/url?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20211105%2F1636100987-pershy-u-vobl

Навіны | Папулярнае

15:22 Агульная аўдыторыя блогераў — удзельнікаў «Марафона адзінства» ў Маладзечне складае каля 2,4 млн. (/be/news/20241011/1728649341-agulnaya-audytoryya-blogerau-udzelnikau-marafona-adzinstva-u-maladzechne)

15:15 Пруднікава: Энергетыка Беларусі сёння адна з самых чыстых і эфектыўных у свеце (/be/news/20241011/1728647582-prudnikava-energetyka-belarusi-syonnya-adna-z-samyh-chystyh-i-efektyunyh-u)

14:47 «Белпошта» бясплатна даставіць паштовыя карткі напярэдадні Дня маці (/be/news/20241011/1728645976-belposhta-byasplatna-dastavic-pashtovyya-kartki-napyaredadni-dnya-maci)

14:20 Сабаленка стала паўфіналісткай турніру WTA-1000 ва Ухані (/be/news/20241011/1728645621-sabalenka-stala-paufinalistkay-turniru-wta-1000-va-uhani)

14:07 Сям'ю года выбіраюць у Мінску (/be/news/20241011/1728644856-syamyu-goda-vybirayuc-u-minsku)

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

Іншыя матэрыялы аўтара

Увосень работ восем (/be/news/20241009/1728489006-uvosen-rabot-vosem)

«Гэта вельмі нялёгкая місія — здабываць хлеб» (/be/news/20241009/1728485320-geta-velmi-nyalyogkaya-misiya-zdabyvac-hleb)

Хобі — ствараць прыгажосць (/be/news/20241008/1728391256-hobi-stvarac-prygazhosc)

Урокі гісторыі ў стылі «рэтра» (/be/news/20241007/1728314359-uroki-gistoryi-u-styli-retra)

Сёння Брэстчына святкуе абласныя «Дажынкі» ў Мікашэвічах (/be/news/20241004/1728054388-syonnya-brestchyna-svyatkue-ablasnyya-dazhynki-u-mikashevichah)

(https://www.kupala.by)

Выбар рэдакцыі

Грамадства (/be/gramadstva) (/be/news/20241010/1728575223-universalnaya-mova-yakasci)

Універсальная мова якасці (/be/news/20241010/1728575223-universalnaya-mova-yakasci)

Аб развіцці стандартызацыі ў Беларусі расказалі эксперты.

0 72

Экалогія (/be/ekalogiya) (/be/news/20241010/1728574622-shto-kozhny-ahvotny-mozha-zrabic-kab-palepshyc-lyubimy-gorada)

Што кожны ахвотны можа зрабіць, каб палепшыць любімы горад? (/be/news/20241010/1728574622-shto-kozhny-ahvotny-mozha-zrabic-kab-palepshyc-lyubimy-gorada)

Супрацоўнікі Мінпрыроды расказалі, якая карысць ад дрэў у горадзе.

0 73

Сельская гаспадарка (/be/selskaya-gaspadarka) (/be/news/20241009/1728489006-uvosen-rabot-vosem)

Увосень работ восем (/be/news/20241009/1728489006-uvosen-rabot-vosem)

Якія задачы стаяць перад аграрыямі восенню?

0 134

Навука (/be/navuka) (/be/news/20241007/1728311494-kolki-u-belarusi-karysnyh-vykapnyau)

Колькі ў Беларусі карысных выкапняў? (/be/news/20241007/1728311494-kolki-u-belarusi-karysnyh-vykapnyau)

У поўным аб'ёме задаволена патрэба краіны ў калійных і каменных солях, торфе, сапрапелі, будаўнічым камені, падземных водах.

(https://www.butb.by/)

0 174

Нашы партнёры:

(https://center.gov.by/) (http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://wwv

ЗВЯЗДА (/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2024 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”.
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)
Экстрэмісцкія матэрыялы (/be/page/respublikanski-spis-ekstremisckih-materyyalau)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

6 345
4 214
3 991
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://t.me/zviazda_online)